*Рэспубліканская алімпіяда па беларускай мове і літаратуры*
*другі этап (раённы, гарадскі)*
*2019/2020 навучальны год*

*Шыфр удзельніка*

_______________

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
абласнога арганізацыйнага
камітэта
Рэспубліканскай алімпіяды
першы намеснік
начальніка галоўнага ўпраўлення
па адукацыі
Віцебскага абласнога выканаўчага
камітэта

А.Л. Баграновіч

"12" лістапада 2019 года

# Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры
# XI клас

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** Прачытайце урывак з эсэ, якое Рыгор Барадулін прысвяціў паэту – свайму сябру, настаўніку і “хроснаму бацьку”. Назавіце імя і прозвішча паэта.

У падкрэсленых выразах хаваецца ключ да адгадкі імені. Запішыце, як называюцца такія тропы.

Устаўце, дзе патрэбна, прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі, афармляючы тэкст у адпаведнасці з арфаграфічнымі і граматычнымі нормамі.

*Максімальная колькасць балаў –* ***5***
*(за арфаграфічныя і граматычныя нормы – 4 б. ( -0,2 б. за кожную памылку);*
*за імя і прозвішча – 1 б.;*
*за назву тропа – 1 б.).*

У імені гэтага паэта чуецца наступ хваль і стог..н галубоў, выгін лугавіны і выган ля ўзлеску, выгук волі і стрыманасць бол(і, я, ю). Выгукнеш яго імя – і чуеш, як мачталомны вецер спрабуе на трываласць ветразь веры ў разгневан..ым блакіце. Веры ў роднае слова і ў народ, які праз стагоддзі пакут, змагання і абраз пранёс яго, каб народам застацца, застацца самім сабой.

За вонкавай паважнасцю, самавітасцю <u>прызнанага барда</u> хаваюцца задзірыстасць і даверлівасць, апантанасць і чуласць <u>сенненскага мальца</u>, унука дзеда Цярэшкі. І за ўсім гэтым стаіць дасве..чанасць, дапытлівасць, віртуозная лёгкасць у абыходжанні са словам. <u>Спрактыкаваны віртуоз</u> настолькі добра адчувае роднае слова, што (пад) час цяжка адрозніць, свежае гэта, яшчэ (не) зацяганае слова з найбагацейшай на слоўнікавы запас Віцебшчыны ці проста н..ватвор.

Ёсць у <u>шанавальніка крамянага слова</u> заўсёды вонкава ахайная і зручная запісная кніжачка. Ляжыць гэты зграбненькі томік на пісьмовым стале і, здаецца, сам запаўняецца пачаткамі будучых вершаў, паэм, дасціпнымі выразамі, народнымі чатырохрадкоў..ямі і

словамі, якіх н.. знойдзеш н.. ў якім слоўніку. Дарэчы, да слоўнікаў у гэтага паэта даўняя пашанлівая любоў.

Як таямнічы вядун, адгорне майстар цупкую кніжачку, дзе ак..уратны і няспешлівы поч..рк падкрэслівае і характар паэта, і падорыць каму загаловак будучай кнігі, каму радок, каму слова, якое адразу верш прывабным зробіць.

(Што) дзень праца над словам, шліфоўка слова, выв..рка кожнага гуку на сл..х.

У збіранні слоў, у пошуках у гэтага паэта ёсць нешта ад рыбака і грыбніка. Любіць нерушы і знаходзіць іх! *(Паводле Рыгора Барадуліна)*

*Імя і прозвішча паэта:*

________________________________________________________________________

*Прызнаны бард, сенненскі малец, спрактыкаваны віртуоз, шанавальнік крамянага слова –* __________________________________________________________

**Заданне 2.** *Рыгор Барадулін любіць гуляць са словам, але ўмее ў слова і ўслухоўвацца.*

Прачытайце вершаваныя радкі паэта. Выпішыце і затранскрыбіруйце самастойныя часціны мовы з арфаграмамі, напісанне якіх заснавана на марфалагічным прынцыпе.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6***
*(за кожнае правільна знойдзенае слова – 1 б.;*
*за кожную памылку -0,5 б.).*

Баюся

Наказ свой напісаць хачу, але баюся
І напамінам разбудзіць бяду.
Пакуль жыву,
Датуль малюся Беларусі
І да сваіх з малітвай гэтай адыду.

З сабою Беларусь насіў па белым свеце,
Дзе толькі я ступаў,
Там і яна была.
Нашчадак крывічоў,
Я меў адно на мэце –
Як кужаль, адбяліць і слова дабяла.

Каб ручніком кужэльным выцер вочы
Наступнік мой і позіркам з'яснеў.
Мне сонечнілі дзень
І ранішнілі ночы
Крывіцкая мілосць,
Крывіцкі рупны гнеў.

Калі адчую,
Што прыйшло маё бяссілле,
Прасіць пачну
Як самай Боскай мілаты,
Каб і вятры па-беларуску галасілі,
Нудзіліся па-беларуску чараты.

Ідзе мой цень лясны замроенай травою,
Сцяжына з дому і дамоў вядзе адна.
Не томіцца трымаць зялёнай галавою
Вушацкі небасхіл
Вушацкая сасна.

***Заданне 3.*** Рыгор Барадулін перакладаў з 37(!) моў. З асаблівай прыхільнасцю ён ставіўся да твораў прадстаўнікоў пакрыўджаных народаў, падкрэсліваючы: "Няма народаў малых, бываюць малыя паэты".

Перакладзіце на беларускую мову ўрывак з эсэ Ігара Шклярэўскага, якога называюць найлепшым перакладчыкам вершаў Рыгора Барадуліна на рускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **7***
*(за кожную памылку -0,5 б.).*

Бородулин – это Беларусь.

Такая у него судьба, такой чудесный дар – создать живой язык и превратить свою фамилию в синоним леса, дома, огорода, колодезного ворота, ведра с холодной солнечной водой.

И это он – дымок, летящий над полями, когда сжигают картофельную ботву.

Это в его словах пульсируют земля и небо – родники и жаворонки.

Все остается только в слове, и только в нем вчерашнее не исчезает.

Таким неуходящим словом – простым и неожиданным, со всеми красками радуги, со всеми фонетическими отзвуками болот, лугов и сосен – Бог одарил Рыгора Бородулина.

**Заданне 4.** *"Айчына Барадуліна – Мова. Тут ён паўнапраўны гаспадар. Чытаеш барадулінскую паэзію, і рука сама цягнецца да асадкі, каб выпісаць прыдуманыя паэтам словы. Зайздрошчу тым лексікографам, якія калі-небудзь складуць слоўнік Рыгора Барадуліна. Яны спрычыняцца да свята мовы, якога раней мы не ведалі". (Міхась Скобла)*

Знайдзіце аўтарскія неалагізмы і, паставіўшы ў пачатковую форму, запішыце іх у табліцу. Пазначце, ад якіх слоў яны ўтварыліся і якім спосабам.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6***.

1. За гаркоту і за насалоду, Гаспадар, паклон зямны прымі.
2. На шчырасці трываліцца зямля.
3. Радасць ранішняга забыцця, эра неразбуджанай трывогі. Голас маладога пачуцця. Існасці абсяг зялёнастогі.
4. «Вось гэта новае!» – пачуеш крык дапытніка ў даверлівым настроі. А новаму згубіўся нават лік, яно – даўно забытае старое.

| Неалагізмы | Ад якіх слоў утварыліся | Спосаб утварэння |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

**Заданне 5.** *Рыгор Барадулін прызнаваўся: "Я жыву ў імя ўсяго беларускага, жыву дзеля служэння беларускаму слову". "Вушацкі словазбор" – адзін з выніковых твораў паэта. І пісаўся гэты твор, паводле слоў аўтара, амаль 60 год. Яшчэ хлопчыкам у сёмым класе Барадулін узяў сшытачак, зрабіў з яго нататнік і пачаў запісваць розныя народныя словы і выразы роднай Ушаччыны. І першай, за кім ён пачаў занатоўваць розныя цікавінкі, была маці Куліна.*

Прачытайце прыклады, узятыя з "Вушацкага словазбору Рыгора Барадуліна". Падбярыце да падкрэсленых слоў сінонімы і запішыце іх у пачатковай форме.

*Максімальная колькасць балаў –* ***4.***

| Слова | Сінонім (у пачатковай форме) |
|---|---|
| Шашаль (цяпер клешч завуць) завёўся ў муцэ, ператачыў усю муку – адна шашчá засталася. | |
| Часты́ там такія былі, што дасюль есці не хочацца. | |
| Пальцы ў яго цу́пкія: як ухопіцца, дык не выпусціць. | |
| Нікога не баіцца, нікога і слухаць не хоча распушчонік. | |

**Заданне 6.** Знайдзіце ў вершаваных радках Рыгора Барадуліна ўсе дзеяслоўныя формы. Запішыце іх у табліцу, паставіўшы ў форме 2-й асобы множнага ліку. Вызначце тып спражэння.

*Максімальная колькасць балаў – **4**.*

А стараліся дружна і свой і чужы
На здранцвелым, на востракутым
Небу роўную маці распяць на крыжы
І аддаць Беларусь пакутам.

| Форма 2-й асобы множнага ліку | Спражэнне |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 7.** Прачытайце ўрывак з верша “Ніщто паўтарыць немагчыма…” Рыгора Барадуліна. Выпішыце выказнікі і назавіце іх від.

*Максімальная колькасць балаў – **4**.*

Цябе паўтарыць немагчыма,
Таксама як і мяне.
Хай лёсу твайго аблачына
Пральецца дажджом па вясне,
Каб зноў паўтарылася ценем
І рунню ўзялося хутчэй
Народжанае летуценнем
Вясновае свята вачэй.

| Выказнікі | Від выказніка |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 8.** *Другая палова 50-х – пачатак 60-х гадоў надзвычай ураджайныя ў беларускай літаратуры. Гэтаму спрыяла грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне пасля асуджэння культу асобы Сталіна. У літаратуру прыходзіць пакаленне пісьменнікаў, чыё дзяцінства было апалена вайной, пакаленне "паэтаў-бязбацькавічаў", па словах Рыгора Барадуліна. Літаратурная крытыка яшчэ называе гэтае пакаленне філалагічным.*

Патлумачце, чаму пакаленне паэтаў-шасцідзясятнікаў называюць філалагічным.

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

Падкрэсліце прозвішчы пісьменнікаў, якія належаць да аднаго пакалення з Рыгорам Барадуліным.

*Максімальная колькасць балаў –* ***5***
*(2 б. – за тлумачэнне;*
*максімальная колькасць за прозвішчы*
*пісьменнікаў – 3 б., ад якіх*
*-0,5 б. за кожную памылку).*

Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч, Ніл Гілевіч, Максім Танк, Аркадзь Куляшоў, Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі, Міхась Лынькоў, Еўдакія Лось, Пімен Панчанка, Цётка, Янка Сіпакоў, Кузьма Чорны, Янка Брыль, Раіса Баравікова.

**Заданне 9.** *"Рыгор Барадулін быў дадзены беларускай літаратуры на ўрост. Да яго яшчэ трэба дарастаць" (Міхась Скобла).*

Прачытайце радкі вершаў-прысвячэнняў Рыгора Барадуліна. Запішыце, каму гэтыя творы прысвечаны.

*Максімальная колькасць балаў –* ***3****.*

| Вершаваныя радкі | Каму прысвечаны |
|---|---|
| Марыў … пра гордае шэсце<br>Праўды,<br>А перад усім,<br>*З цэлым народам гутарку весці*<br>Думаў,<br>Але не з глухім! | |
| На развітанне нястомны працаўнік,<br>Як трохзор'е,<br>Як трохзярнянцце,<br>Абраніў трохслоўе:<br>Быў. Ёсць. Буду.<br>Гукнем жа ўслед глыбіннадумцу,<br>Гукнем яму ў вячніну:<br>Быў! Ёсць! Будзеш!<br>Будзеш!<br>Будзеш! | |

| | |
|---|---|
| Чытай, грамацей, –<br>Ён Мацей Бурачок.<br>А на Мацея<br>Дарога пацее<br>Спіной мужыка,<br>Што спазнала дручок<br>І на бізун<br>Яшчэ мае надзею. | |

**Заданне 10.** *Кожная нацыянальная мова мае непаўторную фанетычную сістэму. У сучаснай беларускай паэзіі гукавой выразнасцю вылучаюцца творы Рыгора Барадуліна. “Барадулін, здаецца, можа зрабіць з вершам усё, што хоча, – такая яго ўлада над словам… Творыцца паэзія вялікай пераканаўчасці, духоўнай змястоўнасці і сілы” (Варлен Бечык).*

Назавіце прыёмы гукапісу, выкарыстаныя Рыгорам Барадуліным у падкрэсленых спалучэннях.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6****.*

| Вершаваныя радкі | Прыём гукапісу |
|---|---|
| Ад тупату,<br>грукату,<br>гоману –<br>тлумна.<br>І жытам прапахлі утулкі калёс.<br>Пустыя такі, падхартаныя гумны,<br>Прымайце, –<br>вязе ураджай<br>снапавоз. | |
| Таямніца прыцемку і зерня.<br>Цені на калінавых мастах.<br>Містыка. Містэрыя. Майстэрня.<br>Маці,<br>Маціевіч. Маг. Мастак. | |
| З буслянятамі прыляцела,<br>Села на сваім азяродзе.<br>Галаву закідвае смела<br>І клякоча,<br>І ў ціхай згодзе<br>Памагаюць ёй бусляняткі<br>Клекатаць:<br>– Кле, кле, кле! – на палеткі<br>Льецца клёкат. | |
| Сівая бабулька –<br>Як тая прасніца:<br>З парадзелай кудзелі<br>Ейных кудзёрак<br>Старасць –<br>Старанная пралля –<br>Пражу прадзе… | |

| | |
|---|---|
| Мядзведзю старому,<br>Як грузнаму ла́му,<br>Нязручна ступаць па ламу́ –<br>Яшчэ заколеш лапу<br>На сваю галаву. | |
| Ад урокаў крапіва ды палыны:<br>Зві папружку дый тужэй аперажыся.<br>Дамавіты, дымавіты, смаляны<br>Дужы дух паблытаў вольна долы й высі. | |